**УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”**

# ПРУДНІКАЎ ПАВЕЛ ІВАНАВІЧ

**ПАЭТ, ПРАЗАІК, НАРЫСІСТ,**

**ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**1 (14) ЛІПЕНЯ 1911 Г. – 16 САКАВІКА 2000 Г.**

**ФОНД № 332**

**ВОПІС № 1**

**1956 – [кан. 1990-х], коп. за 1931–[1933] гг.**

**МІНСК 2020**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 ф. 332**


| №№ | Назва раздзелаў | № справў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ П.І. ПРУДНІКАВА | 1-31 | 1-4 |
| 2. | ПІСЬМЫ П.І. ПРУДНІКАВУ, АСАБІСТЫЯ ДАКУМЕНТЫ П.І. ПРУДНІКАВА І ІНШ. | 32-40 | 4-5 |
| 3. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 41-44 | 5-6 |
| | СПІС КНІГ | | |

## Прадмова

**Пруднікаў Павел Іванавіч** нарадзіўся 1 (14) ліпеня 1911 г. у сялянскай сям'і ў вёсцы Стары Дзедзін Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні (цяпер Клімавіцкі раён Магілёўскай вобласці). Разам з бацькамі працаваў на гаспадарцы, вырабляў на продаж гаршкі. Насуперак волі сям'і ў верасні 1917 г. пайшоў у трохкласную школу ў роднай вёсцы, дзе адвучыўся месяц да яе закрыцця. Напачатку 1920-х гг. паступіў у Новадзедзінскую сярэднюю школу, у 1925 г. перавёўся і ў 1926 г. скончыў Старадзедзінскую пачатковую школу. У 1926–1929 гг. без дазволу бацькоў вучыўся ў Мілаславіцкай 7-гадовай школе. Арганізаваў і кіраваў літаратурным гуртком, у які ўваходзілі К.Л. Грыневіч, П.Н. Кавалёў, І.Р. Новікаў і А.Т. Пруднікаў. Працаваў юнкорам газет "Беднота", "Беларуская вёска", "Комсомольская правда", "Крестьянская газета", "Ленинские искры", "Піянер Беларусі" і "Чырвоная змена". З 1930 г. працаваў на Данбасе: выводзіў доменныя печы на Краматорскім металургічным заводзе (цяпер – Краматорскі металургічны завод імя В.У. Куйбышава), працаваў шахцёрам на Горлаўскім і Чырвонаармейскім рудніках. У тым жа годзе вярнуўся дадому. Не атрымаўшы дазволу сельсавета на выезд з вёскі, паехаў у г. Мінск па падробных дакументах. Працаваў на будаўніцтвах чыгуначнай лініі "Асіповічы–Магілёў–Крычаў–Рослаўль" і шаўковай фабрыкі (былы Завод штучнага валакна імя В.У. Куйбышава) у г. Магілёве. Вярнуўся ў г. Мінск, жыў у стрыечнага брата – паэта А.Т. Пруднікава, працаваў грузчыкам. У лістападзе 1930 г. пры дапамозе літаратурнага крытыка С. Левіна (псеўданім Стручок) перайшоў на кніжную базу, дзе працаваў стажорам-фактуроўшчыкам. У сакавіку 1931 г. як былы селькор быў запрошаны на работу ў аддзел пісьмаў рэдакцыі газеты "Беларуская вёска". У маі таго ж года перайшоў на працу хранікёра на мінскае радыё, у верасні – карэктара газеты "Звязда". З лістапада 1931 г. да лютага 1932 г. быў літсупрацоўнікам газеты "Савецкая Беларусь", з лютага да мая 1932 г. – рэпарцёрам БелТА. У чэрвені 1932 г. па запрашэнні Клімавіцкага РК КПБ працаваў у рэдакцыі райгазеты "Камуна". У верасні таго ж года паступіў на творчае аддзяленне літфака Беларускага дзяржаўнага педагагічнага інстытута (цяпер – Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка) і пакінуў яго праз 3 месяцы з-за канфлікту з выкладчыкам В.В. Барысенкам. Кароткі час вучыўся на факультэце замежных моў Ленінградскага педагагічнага інстытута імя А.І. Герцэна (цяпер – Расійскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя А.І. Герцэна), у 1933–1937 гг. – на факультэце мовы і літаратуры Ленінградскага педінстытута імя А.С. Бубнова (цяпер – Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт), (вывучаў балгарскую і сербскую мовы), пасля – атрымаў накіраванне ў аспіранту Інстытута славяназнаўства Акадэміі навук СССР. У ноч з 10 на 11 ліпеня 1937 г. быў арыштаваны "за варожыя адносіны да савецкай улады і ідэалагічную блізкасць з беларускімі нацыянал-дэмакратамі"[1], асуджаны на 8 гадоў ссылкі і этапіраваны ў Бурацкую АССР, пасля – у Іркуцкую, Омскую

[1] Інтэрв'ю П.І. Пруднікава Л.Г. Маракову // http://pdf.kamunikat.org/25492-18.pdf. – С. 4.

вобласці і г. Нарыльск (Краснаярскі край). Вызваліўся ў жніўні 1945 г.[2], пад ціскам мясцовых уладаў да 1946 г. працаваў загадчыкам бібліятэкі Нарыльскага горна-металургічнага тэхнікума. У 1946 г. (з-за забароны вяртацца ў БССР) прыехаў у Смаленскую вобласць, дзе да 1952 г. настаўнічаў ў сярэдніх школах Ершычскага і Рослаўльскага раёнаў, у 1952 г. перавёўся ў Слабодскую сярэднюю школу (Браслаўскі раён Віцебскай вобласці). У 1968 г. пераехаў у г. Мінск, дзе працаваў старшым рэдактарам бюлетэня “Служба быту Беларусі”. У 1971 г. выйшаў на пенсію.

У 1930 г. упершыню выступіў у друку з вершам “На вакацыі” ў газеце “Піянер Беларусі”. У 1932 г. пад псеўданімам Паўлюк Буравей выдаў першую кнігу вершаў – “Песни грузчиков”. Працягнуў друкавацца ў 1959 г. Аўтар зборнікаў паэзіі “Час майго нараджэння” (1968), “Прысады” (1979), “Мая магістраль” (1981), “Заасцёр’е” (1986), “Заранка” (1987), “Позьнія ягады” (1990) і інш.; збонікаў аповесцяў “Яжовыя рукавіцы” (1987) і “Паўночнае пекла” (1991) і інш.; зборніка ўспамінаў “Далёкае, але не забытае” (1988) і інш.; вершаў “Першамайская” і “У паходы” для песень Ю.У. Семянякі.

У 1971 г. П.І. Пруднікаў быў прыняты ў СП БССР. У 1992 г. атрымаў званне “Заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь”. У 1995 г. за кнігу “За калючым дротам” быў узнагароджаны прэміяй Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

П.І. Пруднікаў памёр 16 сакавіка 2000 г.

Дакументы П.І. Пруднікава паступілі ў БДАМЛМ ад самога фондаўтваральніка ў 1985 і 1994 г. У выніку навуковага апісання быў складзены вопіс № 1, у які ўвайшлі 44 справы (272 дак.) за 1956–[кан. 1990-х], коп. за 1931–[1933] гг.

Вопіс складаецца з 3 раздзелаў. У першым раздзеле – “Творчыя дакументы П.І. Пруднікава” – змешчаны аповесці, сцэнарыі тэлеперадач, зборнікі дакументальных апавяданняў, вершаў, мемуараў, артыкулы, нататкі, рэцэнзіі, выступленні і інш. Справы ў раздзеле сфарміраваны па жанрах і храналогіі за 1958–1992 гг.

У другім раздзеле знаходзяцца пісьмы П.І. Пруднікаву, дакументы аб яго рэабілітацыі, дакументы да юбілеяў, артыкулы і нататкі пра і з яго ўпамінаннем, інтэрв’ю П.І. Пруднікава, дакументы, сабраныя па цікавых для яго тэмах, і інш. Справы ў раздзеле сфарміраваны па намінальна-храналагічным прынцыпе за 1956–1994 гг.

Трэці раздзел прадстаўлены індывідуальнымі і групавой фатаграфіямі П.І. Пруднікава, копіямі яго фатаграфій з іншымі дзеячамі (1931–1932) і копіяй фатаграфіі К.Л. Грыневіча [да 1933 г.] за [1970-я – пач. 1990-х гг.].

Прадмову склала
Вядучы архівіст В.Ф. Шаталава
08.01.2020

[2] Пастановай Ленінградскага гарадскога суда быў цалкам рэабілітаваны ў 1956 г.

ПРАТАКОЛ ЭМК №__________

ад "_____"____________20____ г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ:

Дырэктар БДАМЛіМ

______________ Г.В.Запартыка

"_____"____________20____ г.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ П.І. ПРУДНІКАВА** | | | | |
| 1 | "Вандроўка па пакутах". Аповесць.<br>Аўтограф | 1979 | 156 | 1 | |
| 2 | "Яжоўскія рукавіцы" = "Вожыкавыя рукавіцы". Аповесць.<br>Аўтограф | 1987 | 68 | 1 | |
| 3 | "Паўночнае пекла" = "Пекла". Аповесць.<br>Аўтограф | 1988 | 129 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 4 | "Маладосць мая, незабыўная (Да 70-годдзя Вялікага Кастрычніка)". Сцэнарны план тэлеперадачы № 2, прысвечанай Міхасю Зарэцкаму.<br>Машынапіс з нязначнай аўтарскай праўкай | 1987 | 12 | 1 | |
| 5 | "Маладосць мая, незабыўная (Да 70-годдзя Вялікага Кастрычніка)". Сцэнарны план тэлеперадачы № 3, прысвечанай Міхасю Чароту.<br>Машынапіс з допісамі і аўтарскай праўкай | 1987 | 11 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 6 | "На парахавой бочцы". Зборнік дакументальных апавяданняў.<br>Аўтограф, машынапіс з нязначнай аўтарскай праўкай | 1985 | 159 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 7 | "Заасцёр'е". Паэма.<br>Аўтограф, машынапіс з нязначнай аўтарскай праўкай.<br>Прыкладзена рэцэнзія неўстаноўленай асобы на гэту паэму (аўтограф). Л. 39 | 1968 | 39 | 2 | |
| 8 | "Прыазёрная быль". Паэма.<br>Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай | 1971 | 167 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 9 | "Пікет за пікетам". Паэма.<br>Аўтограф, машынапіс | 1978 | 76 | 1 | |
| 10 | "Запозненае прасвятленне", "Таймыр". Паэмы.<br>Аўтограф | 1990 | 29 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 11 | "Апошняя песня", "Дзявочая лірычная", "Маці", "Родныя мясціны" і інш. Вершы.<br>Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай | 1958-1974 | 31 | 31 | |
| 12 | "Над Бугам", "Рэчка Проня", "Снежань" і інш. Байка, вершы.<br>Выразкі з газет і часопісаў | 1968-1987 | 24 | 44 | |
| 13 | "Ах, мільгаюць гады, нібы хуткі цягнік...", "Весялуха", "Мужчына" і інш. Вершы.<br>Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай, машынапіс | 1976-1992 | 46 | 42 | |
| 14 | "Абібокі", "Апошняя песня", "Будаўнік" і інш. Вершы.<br>Машынапіс з нязначнай аўтарскай праўкай | 1981-1984 | 59 | 42 | |
| | * * * | | | | |
| 15 | "Час майго нараджэння". Падборка вершаў да мяркуемага зборніка.<br>Аўтограф | 1968 | 13 | 1/12 | |
| 16 | "Прысады". Падборка вершаў да мяркуемага зборніка.<br>Аўтограф, машынапіс | 1979 | 15 | 1/10 | |
| 17 | "Мая магістраль". Падборка вершаў да мяркуемага зборніка.<br>Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай | 1981 | 24 | 1/24 | |
| 18 | "Заасцёр'е". Падборка вершаў да мяркуемага зборніка.<br>Машынапіс з нязначнай аўтарскай праўкай, машынапіс | 1986 | 4 | 1/4 | |
| 19 | "Познія ягады". Падборка вершаў да мяркуемага зборніка.<br>Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай, машынапіс | 1990 | 5 | 1/4 | |
| 20 | "Крыніцы". Падборка вершаў да мяркуемага зборніка.<br>Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай, | 1991 | 14 | 1/12 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | машынапіс | | | | |
| | * * * | | | | |
| 21 | "Белы мой лебедзю, мой пабрацім...", "З песняй па жыцці" і інш. Нарысы, прысвечаныя К.Л. Грыневічу, Л.І. Ліхадзіеўскаму, С.В. Законнікаву, С.П. Шушкевічу і інш. Аўтограф, выразкі з газет і часопісаў | 1972-1992 | 45 | 14 | |
| | * * * | | | | |
| 22 | "Азёраўскія падпольшчыкі", "Браслаўскі шоўк", "Рыбацкая дынастыя" і інш. Артыкулы і нататкі. Аўтограф, выразкі з газет | 1972-1992 | 21 | 9 | |
| | * * * | | | | |
| 23 | Рэцэнзіі на кнігі І.І. Васілеўскага "Весёлый поезд: стихи", К.М. Шавеля "Музыка нівы: вершы і паэма" і інш. Анатацыя да зборніка сваіх вершаў "Позния ягады". Аўтограф | 1978-1990 | 14 | 5 | |
| | * * * | | | | |
| 24 | "Людзям патрэбна праўда", "Мова - душа народа", "Перабудова і літаратура" і інш. Выступленні на пленумах СП БССР і СП Беларусі, жалобным мітынгу ва ўрочышчы Курапаты і інш. Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай | 1987-1994 | 22 | 4 | |
| | * * * | | | | |
| 25 | Аўтабіяграфія і біяграфічная даведка аб П.І. Пруднікаве. Машынапіс | [1981], 1985 | 8 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 26 | "Адна сустрэча - успамін на ўсё жыццё", "З душой і сэрцам насцеж", "Славуты лінгвіст і паліглот" і інш. Успаміны аб З.А. Бандарынай, К.А. Пушкарэвічы, П. Трусе, Л.У. Шчэрбе і інш. Аўтограф | 1977-1983 | 66 | 10 | |
| 27 | "Далёкае, але не забытае". Зборнік успамінаў. Аўтограф | 1978-1983 | 168 | 1 | |
| 28 | "Далёкае, але не забытае". Зборнік успамінаў. Варыянт тэксту. | 1983 | 173 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Машынапіс з аўтарскай праўкай | | | | |
| | * * * | | | | |
| 29 | "Домой!", "Родной порог". Вершы П.І. Пруднікава ў перакладзе І.І. Васілеўскага на рускую мову. Выразка з газеты | 1993 | 1 | 2 | |
| 30 | "Кин чукна сайкатэ?" ["Хто прачнуўся раніцай?"], "Луд кеч" ("Заяц") і інш. Вершы П.І. Пруднікава ў перакладзе Г.А. Ходырава на ўдмуртскую мову. Выразкі з газеты "Дась Лу!" (№ 94, 1984) | | 1 | 3 | |
| | * * * | | | | |
| 31 | Аўтабібліяграфія П.І. Пруднікава за 1973-1985 гг. Машынапіс | | 1 | 1 | |
| | **2. ПІСЬМЫ П.І. ПРУДНІКАВУ, АСАБІСТЫЯ ДАКУМЕНТЫ П.І. ПРУДНІКАВА І ІНШ.** | | | | |
| 32 | Пісьмо выдавецтва "Мастацкая літаратура" П.І. Пруднікаву па пытанні вяртання яго рукапісу "Ліпень".<br>Пісьмо праўлення СП БССР з паведамленнем аб умовах замены членскага білета | 1973, 1978 | 2 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 33 | Дакументы аб рэабілітацыі П.І. Пруднікава (копіі і фатаграфіі даведак Ленінградскага гарадскога суда і Упраўлення КДБ СССР па Ленінградскай вобласці і паведамлення Пракуратуры СССР аб спыненні крымінальнай справы супраць П.І. Пруднікава ў сувязі з недаказанасцю яго віны) | 1956-1992 | 4 | 4 | |
| 34 | Запрашальны білет СП БССР П.І. Пруднікаву на вечар, прысвечаны 70-годдзю з дня нараджэння Міхася Чарота.<br>Мандат дэлегата XI з'езда пісьменнікаў Беларусі на імя П.І. Пруднікава | 1966, 1994 | 3 | 2 | |
| 35 | Заявы П.І. Пруднікава ў выдавецтва "Мастацкая літаратура" з просьбай уключыць у выдавецкі план рукапіс яго кнігі "Далёкае, але не забытае" і ў прэзідыум СП БССР з просьбай дазволіць творчыя камандзіроўкі ў г. Нарыльск і Карэльскую АССР (Расія) | 1975-1985 | 3 | 3 | |
| | * * * | | | | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 36 | І.А. Аношкін. "Паэт складанага лёсу", В. Крынічная. "На зямлі бацькоў", С. Кухараў. "У творчай дарозе" і інш. Артыкулы і нататкі, прысвечаныя 60- і 80-годдзям П.І. Пруднікава.<br>Выразкі з газет | 1971-1991 | 8 | 8 | |
| 37 | М.М. Башлакоў. "Паэт заўжды пачуццямі багаты" і інш. Артыкул і нататка, прысвечаныя П.І. Пруднікаву.<br>І. Галіноўскі. "Свята паэзіі". Нататка з упамінаннем П.І. Пруднікава.<br>Выразкі з газет | 1976-1988 | 3 | 3 | |
| 38 | В. Плюскоў. "Магістраль жыцця", Я.С. Садоўскі. "Ён ведаў іх такімі" і інш. Рэцэнзіі і водгук на зборнікі вершаў і ўспамінаў П.І. Пруднікава.<br>Выразкі з газет | 1981-1992 | 8 | 8 | |
| 39 | "Поэзия - удел не только молодых". Інтэрв'ю П.І. Пруднікава карэспандэнту газеты "Знамя юности".<br>Выразка з газеты.<br>"Апошняе інтэрв'ю Паўла Пруднікава". Запіс размовы П.І. Пруднікава з Л.Г. Мараковым.<br>Выдрук з інтэрнэта | 1991,<br>[кан. 1990-х гг.] | 10 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 40 | З. Віталін (Д.Р. Сергіевіч). "Апошні начлег", "Вайна - вайне", "Ідуць гады..." і інш. Вершы са зборніка "Будзем жыць!" (1932).<br>Машынапісная копія | [1970-я гг.] | 19 | 1/12 | |
| | **3. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 41 | Фатаграфіі П.І. Пруднікава, індывідуальныя | 1980-<br>[пач. 1990-х гг.] | 7 | 7 | |
| | * * * | | | | |
| 43 | Фатаграфіі П.І. Пруднікава ў групе з З. Віталіным, К.Л. Грыневічам, А.Т. Пруднікавым, А. Старавыборным і інш. (1931-1932).<br>Копіі | | 2 | 2 | |
| 43 | Фатаграфія П.І. Пруднікава ў час сустрэчы з вучнямі СШ № 150 г. Мінска | [1984] | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 44 | Фатаграфія К.Л. Грыневіча [да 1933 г.]. | 1 | 1 | | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|

Копія

У дадзены вопіс унесена 44 (сорак чатыры)
спраў з № 1 па № 44 , 272 дакументаў.
Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла

вяд. архівіст В.Ф. Шаталава

Дакументы прынялі:

______________________

______________________

"_____"____________20____ г.